## СЕКЦЫЯ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ГІСТОРЫІ

В.А. Фядосік, І.А. Еўтухоў

## СЯРЭДНЯВЕЧЧА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

Добра вядома, што тэрмін «сярэднія вякі» («сярэднявечча») мае заходнееўрапейскае паходжанне, а дакладней, яго вынайшлі італьянскія гуманісты XV-XVI стст. Так была названа эпоха паміж антычнасцю і сучасным ім перыядам Адраджэння, які яны разумелі, перш за ўсё, як зварот да культурных, сацыяльных, палітычных каштоўнасцей антычнага грамадства.

З цягам часу, калі даволі трывала замацаваўся падзел еўрапейскай гісторыі на старажытную, сярэдневяковую і новую, за сярэднявеччам таксама трывала замацавалася дэфініцыя як эпохі гісторыі паміж старажытнасцю і новым часам. Адносіны да такой дэфініцыі з боку савецкай марксісцкай медыевістыкі былі дваістымі. З аднаго боку, яна быццам бы прызнавалася, а з другога, звычайна падкрэслівалася, што «марксісцка-ленінская гістарычная навука ўкладае ў гэтую традыцыйную перыядызацыю зусім іншы змест», а менавіта вучэнне аб грамадска-эканамічных фармацыях і іх змене. У адпаведнасці з гэтым вучэннем сярэднявечча абвяшчалася часам панавання феадальнага ладу вытворчасці, і атрымоўвалася, што сярэднявечча і феадалізм гэта фактычна атаясамленыя паняцці, ва ўсякім выпадку звязаныя непарыўна.

У адпаведнасці з гэтым будавалася і перыядызацыя сярэднявечча: з канца V ст. (падзенне Заходняй Рымскай імперыі пад уціскам варвараў, а ў першыя дзесяцігоддзі СССР гаварылі яшчэ аб «рэвалюцыі рабоў і калонаў») да сярэдзіны XVII ст. (да англійскай буржуазнай рэвалюцыі, прычым падкрэслівалася, што гэта першая буржуазная рэвалюцыя, якая мела агульнаеўрапейскае значэнне, бо заканамерна ўзнікала пытанне: а чаму ні нідэрландская?).

Само сярэднявечча (а значыць, феадалізм) разбівалася на ранняе сярэднявечча (альбо фарміраванне феадалізму) – канец V–сярэдзіна XI стст.; росквіт сярэднявечча (альбо развіты феадалізм) – з сярэдзіны XI ст. да канца XV ст. і позняе сярэднявечча (альбо позні феадалізм ) – XV–першая палова XVII стст.

Апошні рубеж гэтай перыядызацыі быў абвешчаны ў савецкай марксісцкай гістарыяграфіі універсальным. Ён ужываўся да гісторыі любой краіны любога рэгіёна. Між тым абвяшчэнне сярэдзіны XVII ст. заканчэннем еўрапейскага сярэднявечча існавала толькі ў савецкай гістарыяграфіі. У заходняй гістарычнай навуцы гэты рубеж традыцыйна пазначаўся канцом XV ст. альбо пачаткам XVI ст.

Дарэчы так рабілі і медыевісты дарэвалюцыйнай Расіі. Так, у гімназічных падручніках сярэднявечча як частка ўсеагульнай гісторыі ахоплівала V–XV стст.



(пры гэтым курс расійскай гісторыі быў выдзелены ў самастойны). У дарэвалюцыйных «Очерках всеобщей истории, Ч. 2: Новое время (XVI–XIX вв.)» У.М. Перцаў добра абгрунтаваў, што XVI–XVII стст. у заходнееўрапейскай гісторыі – гэта пачатак новай гісторыі.

V–XV стагоддзямі ў нашыя часы пазначалі сярэднявечча такія вядомыя гісторыкі, як Жорж Дзюбі, Арнольд Тойнбі, Жак Ле Гоф (апошні, праўда, зараз прытрымліваецца канцэпцыі «працяглага сярэднявечча» – да канца XVIII ст., выключна з кансерватыўнасці ментальнасці аграрнага насельніцтва Еўропы).

Не лічылі XVI–XVII стст. часам сярэднявечча і гісторыкі краін так званай «народнай дэмакратыі». Вядома, цяжка было ўсвядоміць, напрыклад, нямецкаму гісторыку, што Рэфармацыя – гэта з'ява сярэднявечча.

Асаблівасці перыядызацыі сярэднявечча ў савецкай медыевістыцы паходзілі менавіта з атаясамлівання паняццяў сярэднявечча і феадалізму. Не ўлічваліся недастаткова нераўнамернасць і спецыфіка развіцця розных цывілізацый. Што тычыцца апошняга рубяжа сярэднявечча, то тут былі дададзены і іншыя матывы. Вядома, што капіталістычныя адносіны не складваліся адначасова нават у розных рэгіёнах Заходняй Еўропы. Расія значна адставала ў сваім развіцці ад Італіі, Англіі, Францыі. Тое ж прыгоннае права яшчэ афармлялася, а ў Заходняй Еўропе асабістай залежнасці сялян амаль паўсюдна ўжо не існавала. На некалькі стагоддзяў пазней з'явіліся мануфактуры. Гэта не адпавядала ідэалагічным устаноўкам сталінскага рэжыму.

У выніку быў выкарыстаны тэзіс У. Леніна (які і да яго абвяшчаў шэраг расійскіх гісторыкаў, што вывучалі, дарэчы, не ўсеагульную, а расійскую гісторыю) аб тым, што новая гісторыя Расіі пачынаецца з другой паловы XVII ст. Гэтая перыядызацыя была пашырана на ўсеагульную гісторыю.

Між тым хібы перыядызацыі сярэднявечча ў савецкай марксісцкай гістарыяграфіі вельмі выразна выявіліся пры вывучэнні пазаеўрапейскіх цывілізацый. Што лічыць сярэднявеччам, напрыклад, гісторыі Кітая, Манголіі, арабаісламскай цывілізацыі, Японіі, альбо цывілізацыі Афрыкі ці Амерыкі? І галоўнае, як гэта звязаць з феадальнай фармацыяй, калі самое існаванне там феадальных адносін яўлялася праблематычным. Пайшлі гарачыя дыскусіі аб азіяцкім феадалізме, «усходнім ладзе вытворчасці». На перыядызацыі, напрыклад, азіяцкага сярэднявечча ўсё гэта адбілася такім чынам, што храналагічныя рамкі сярэднявечча для кожнай краіны вызначаліся па-свойму. Для Кітая пачатак сярэднявечча датаваўся канцом II ст., а не V ст., пачатак другога перыяду сярэднявечча – VII ст., а не сярэдзінай XI ст. (для Японіі адпаведна X ст., Манголіі – XII ст. і г.д.). Канчатковым жа рубяжом сярэднявечча для азіяцкіх краін была ўсё ж прызнана сярэдзіна XVII ст., але з агаворкай, што феадальныя адносіны працягвалі панаваць там і далей. Хоць, напрыклад, было дзіўна ўжываць такую перыядызацыю, напрыклад, для Афганістана (дзе, як сцвярджаецца, феадальныя адносіны саспелі

не раней XVIII ст.), альбо для амерыканскіх цывілізацый, якія наогул былі больш падобны да цывілізацый Старажытнага Усходу.

Але, такім чынам, марксісцкая савецкая навука ўсё ж дапускала, што ў кантэксце сусветнай гісторыі храналагічныя рубяжы з'яўляюцца даволі ўмоўнымі.

Зараз мала хто з сур'ёзных даследчыкаў працягвае гаварыць аб асаблівасцях азіяцкага ці афрыканскага феадалізму, што, на наш погляд, заканамерна. У гэтым няцяжка пераканацца, калі, напрыклад, зрабіць спробы знайсці аналагі еўрапейскага феоду, альбо адносінам сузерэнітэту-васалітэту ў цывілізацыях Азіі. Такія спробы рабіліся ў прыватнасці, на нашай кафедры. Больш-менш падобнае мы знайшлі ў Японіі X–XV стст., і гэта бадай што ўсё. Таму прыйшлося пагадзіцца з расійскім даследчыкам Л.С. Васільевым, што немагчыма ніякая агульная перыядызацыя пазаеўрапейскіх цывілізацый, якая б была заснавана на комплексе аб'ектыўных крытэрыяў, няхай і другарадных. Выйсце тут адно – прыняць нейкія ўмоўныя храналагічныя рамкі. Па-за рамкамі заходнееўрапейскага сярэднявечча гэта азначае адмаўленне ад строгай сувязі сярэднявечча – феадалізм.

Далёка не ўсё адназначна і з сувяззю заходнееўрапейскі феадалізм – сярэднявечча. З аднаго боку, узнікненне феадальных сацыяльна-палітычных і эканамічных структур можа быць адзначана прынамсі ў трох заходнееўрапейскіх рэгіёнах у блізкія ў часе тэрміны (V–IX стст.) – дзяржава франкаў, каралеўства вестготаў, англасаксонская гептархія. Стабілізацыя новых структур можа быць аднесена да X ст. Пасля стабілізацыі пачалося іх пашырэнне на новыя тэрыторыі.

Выснова пра пашырэнне новых структур дазваляе ўвесці паняцце «кантактная зона», пад якой трэба разумець тэрыторыю, дзе адбываецца ўзаемадзеянне заходнееўрапейскіх феадальных структур з тымі, якія існавалі ў аўтахтонных грамадствах. Прыкладамі кантактных зон могуць служыць Скандынавія, Сярэдняя і Усходняя Еўропа, Візантыя, Блізкі Усход. Пры гэтым Скандынавія да XII ст. была цалкам інтэгравана да складу заходнееўрапейскага грамадства. Уплыў апошняга на краіны і народы Сярэдняй і Усходняй Еўропы заслугоўвае асобнага абмеркавання. Самабытная Візантыя ў 1204 г. была фактычна знішчана крыжакамі. Позняя Візантыйская імперыя, якая адрадзілася ў другой палове XIII ст. і праіснавала да 1453 г., уяўляла сабой своеасаблівы сінтэз уласна візантыйскіх і заходнееўрапейскіх (праз Лацінскую імперыю, ці Раманію) структур. На Блізкім Усходзе дзяржавы крыжакоў, аж да свайго знікнення ў XIII ст., былі цалкам чужародным целам у араба-ісламскім свеце.

Вылучэнне кантактных зон ставіць перад даследчыкам шэраг пытанняў. Напрыклад, з якога часу можна гаварыць пра скандынаўскае сярэднявечча? Ці можна лічыць Візантыю краінай заходнееўрапейскага сярэднявечча, калі яна мае зусім асобныя перыяды свайго развіцця (V–VII стст., 2-я палова VII–пачатак XIII стст., пачатак XIII–2-я палова XV стст.)?



Каб адказаць на гэтыя пытанні, трэба прысвоіць паняццю «заходнееўрапейскае сярэднявечча» прынамсі тры значэнні:

1. = феадалізм – вызначае Заходнюю Еўропу цалкам, у тым ліку Скандынавію з XII ст., Візантыю з XIII ст., сярэдняеўрапейскія краіны па меры таго, як яны патраплялі пад уплыў Свяшчэннай Рымскай імперыі.

2. = сінхранізацыйная храналагічная метка – вызначае той перыяд у гісторыі Скандынавіі, які заходняя гістарыяграфія называе «цёмнымі вякамі».

3. = храналагічная рамка – вызначае той перыяд у грэчаскай гісторыі, які наступіў пасля старажытнасці (пры гэтым тэрміны Візантыя і сярэднявечная Грэцыя атаясамліваюцца).

Пытанне пра Усходнюю Еўропу стаіць асобна. Справа ў тым, што тут была кантактная зона прынамсі двух грамадстваў: заходнееўрапейскага і візантыйскага. Таму адназначна аднесці гэты рэгіён да таго ці іншага сярэднявечча цяжка. Трэба ўлічваць шмат фактараў, у тым ліку і тыя, якія здаюцца на першы погляд другараднымі, аднак такімі на самой справе не з'яўляюцца.

На нашу думку, калі няма ці наогул не можа быць адзінай храналагічнай матрыцы, трэба карыстацца цывілізацыйным падыходам. Менавіта ён, з яго ўлікам асаблівасцей, нераўнамернасці развіцця розных грамадстваў, дае найбольшы плён. Дарэчы ён дазваляе пераадолець еўропацэнтрызм, на якім зацыклена большасць беларускіх даследчыкаў, а гэта вынік, перш за ўсё, савецкай сістэмы гістарычнай адукацыі.

Еўропацэнтрысцкі падыход да гісторыі робіць эталонам для сярэднявечча Еўропу (адсюль і здзіўляючыя тэзісы аб яе авангарднай ролі ў сярэднія вякі). Але ж што адбывалася ў культуры Еўропы, калі ў VIII ст. у Кітаі пачала выдавацца першая друкаваная газета, з XI ст. з'явіўся разборны шрыфт, у Японіі VIII ст. мноства паэтаў пісалі вершы танка, а арабы захапляліся творамі выдатных грэкаў, што сталі невядомымі ў Заходняй Еўропе?

Менавіта цывілізацыйны падыход дае разуменне нераўнамернага і ачаговага характару развіцця цывілізацый да новага часу.

Тэрмін «сярэднявечча», перыядызацыя сярэднявечча ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі непазбежна выступае як умоўны. Сама перыядызацыя тут патрэбна хутчэй для сінхранізацыі гісторыі розных цывілізацый. Прымальнымі рубяжамі для сярэднявечча можна прызнаць тыя ж V–XV стст. Не трэба яго расцягваць да XIX ст. як прапануюць, напрыклад, Жак Ле Гоф ці Л.С. Васільеў. Ёсць выдатны храналагічны арыенцір – рубеж XV–XVI стст., калі адбываюцца геаграфічныя адкрыцці і заходнееўрапейская цывілізацыя пачынае здзейсняць тое, што не ўдалося раней ніводнай з іншых цывілізацый – злучаць лёсы асобных цывілізацый свету ў адзін гістарычны лёс чалавецтва.